# СУСТРЭЧА 5

# ЖЫЦЦЁ ЛАСКАМІ САКРАМЭНТУ СУЖЭНСТВА

---

«Гэты сакрамэнт з’яўляецца настолькі адметным, што яго суб’ектам з’яўляецца не асоба, як у іншых сакрамэнтах, а пара сужэнцаў. Сапраўды: ён стварае, ён пасвячае і асвячае гэтую малую супольнасць, адзіную ў сваім родзе, якую будуюць мужчына і жанчына ў сужэнстве. І дадаткова гэта саюз, які па сваёй сутнасці ахінуты прывілеем ласкі, якая ўключае яго ў Містычнае цела Хрыста».

Кс. Анры Кафарэль

---

**1. Уводзіны**

Мы сустракаемся як сакрамэнтальныя сужэнствы. Рух Equipes Notre-Dame з’яўляецца рухам для сакрамэнтальных сужэнстваў. Чым з’яўляецца сакрамэнт? Чым з’яўляецца сакрамэнт сужэнства? Гэта толькі на першы погляд простыя пытанні. Таму на гэтай сустрэчы мы будзем канцэнтравацца на сакрамэнце сужэнства. Праз сакрамэнт сужэнства Хрыстос становіцца ўдзельнікам нашага сужэнскага жыцця. Становіцца Трэцяй, найважнейшай Асобай, Якая павінна пастаянна прымаць удзел у нашых рашэннях, у нашай любові.

**2. Сустрэча суполкі**

## *І ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*



- ***Супольны пасілак і дзяленне жыццём***

У першай частцы мы прымаем пасілак, пад час якога дзелімся жыццём. Мы павінны быць падрыхтаваныя да гэтага. Калі мы дзелімся жыццём, мы аддаём частку сябе. Не ўсё можа і павінна быць сказана, але наш дар павінен быць багаты, такі, каб іншыя сужэнствы мелі адчуванне, што прымаюць удзел у нашым жыцці. Перад пасілкам мы прамаўляем малітву.

## *ІІ ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*





***Малітва супольнасці***

Напачатку, як на кожнай сустрэчы суполкі, мы скіруем нашыя патрэбы да Святога Духа, каб усё, што мы скажам, было закаранёна ў Божай ласцы.

---

«Наступная частка малітвы дае кожнаму магчымасць выказаць уголас роздумы і пачуцці, натхнёныя тэкстам Святога Пісання праз Ліст Equipes Notre-Dame. Патрэбна таксама прадугледзець хвіліну цішыні, каб даць магчымасць кожнаму ўсталяваць больш блізкі, больш асабісты кантакт з Богам».

Карта END

---

Мы прапануем на гэтай сустрэчы паразважаць над фрагментам з Евангелля святога Мацвея. Дар чалавечай любові асвечаны сакрамэнтам мае глыбокі сэнс у Слове Божым. Давайце дазволім, каб словы, прамоўленыя да нас Богам, сталі дарам для іншых удзельнікаў сустрэчы.

**Непарушнасць сужэнства (Мц 19, 3-6)**

«Тады падышлі да Езуса фарысеі і, выпрабоўваючы Яго, пыталіся: «Ці дазволена чалавеку з усялякай прычыны разводзіцца са сваёй жонкаю?» Ён жа, адказваючы, сказаў: «Хіба вы не чыталі, што Стварыцель спачатку стварыў іх мужчынам і жанчынай?» І сказаў: «Таму пакіне мужчына бацьку і маці і злучыцца з жонкай сваёй, і будуць двое адным целам. Так што яны ўжо не двое, але адно цела. Таму, што Бог злучыў, чалавек няхай не разлучае».

У спантаннай малітве дзякуем Богу за атрыманыя дары, просім Яго, каб удзяліў нам дары, якіх мы найбольш патрабуем. Скончым нашу малітву інтэнцыямі, якія мы даверым усёй нашай супольнасці. Будзем насіць гэтыя інтэнцыі ў сэрцы да наступнай сустрэчы і ўзгадаваць іх падчас нашых малітваў. Духоўны дарадчык занясе іх да Божага алтара.

**Малітва**

*Ойча Нябесны, мы дзякуем Табе за гэты свет, а асабліва за тое, што Ты захацеў стварыць чалавека на Сваё падабенства: ва ўзаемнай любові паміж мужчынам і жанчынай мы можам прычыніцца да развіцця і росту нашага асабістага жыцця, а таксама прымаць удзел у стварэнні новага чалавека. Мы прагнем нанова і з большай свядомасцю прыняць гэты дар сакрамэнтальнага сужэнства і сям'і. Амэн.*

## *III ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

***Духоўнае жыццё. Паглыбленне веры і любові***

Апошняя частка сустрэчы ўпершыню будзе выглядаць па-іншаму. Упершыню апрача размовы на фармацыйную тэму і абмену думкамі аб тэксце, прызначаным на гэтую сустрэчу, мы будзем дзяліцца тым, як наша сужэнства наблізілася да Бога, выкарыстоўваючы прапановы Руху END. Вы распавядзеце аб сваім сужэнскім дыялогу ў прысутнасці Бога, які з'яўляецца адным з прапанаваных Рухам пунктаў высілку. Толькі ў другой частцы мы будзем размаўляць аб тэксце, карыстаючыся пытаннямі прапанаванымі вамі альбо змешчанымі ў матэрыялах.

- ***Харызмат Руху і педагогіка***

«Пасля малітвы патрэбна прысвяціць крыху часу на тое, каб падзяліцца ўвядзеннем у жыццё абавязкаў, акрэсленых у Карце. Кожнае сужэнства шчыра апавядае, ці выконвала падчас мінулага месяца абавязкі накладзеныя на іх Картай.

Існуе, канечне, інтымная і асабістая сфера, якую не трэба адкрываць нават сябрам. (...) Пры такой умове практыка дзяліцца праблемамі і адгукацца ў прастаце сэрца на ўзаемную братэрскую дапамогу адпавядае сапраўднай евангельскай любові. Колькі

сужэнстваў было ўратавана ад руціны, а нават ад распаду, дзякуючы таму, што яны не засталіся сам на сам са сваімі змаганнямі!»

Карта END

---

Калі мы дзелімся рэалізацыяй канкрэтных пунктаў высілку, гэта не павінна выглядаць, як прэзентацыя «хатняга задання». Гэта напоўнены ўнутранай засяроджанасцю аповед аб духоўным узрастанні, аб тых чарговых кроках, якія мы зрабілі ў накірунку Бога. Не бойцеся гэтага аповеду. Тут няма тых, хто выйграў і прайграў. Ёсць толькі тыя, хто прыклаў высілак і тыя, хто ад яго адмовіліся. Каб зразумець, які сэнс і якую вартасць прыносіць момант, калі мы дзелімся пунктамі высілку, мы павінны перад усім разумець азначэнне «духоўны рост».

Мы духоўна ўзрастаем тады, калі ў нашым жыцці з кожным разам усё лепш выконваем план, які падрыхтаваў для нас Бог. Гэты план не такі, як план дырэктара фірмы, які працаўнікі павінны рэалізаваць, каб фірма дасягнула поспеху. Гэты план Бог падрыхтаваў для нас і гледзячы на нас, бо Ён нас любіць. Ён ведае, што найлепшае для нас. Аднак, шануючы нашу свабоду, Ён не аддае загадаў і не націскае з сілай на Свае планы, не прымушае нас іх рэалізоўваць. Давайце ўспомнім гісторыю сустрэчы багатага чалавека з Хрыстом.

*«І вось, да Яго падышоў адзін чалавек і сказаў: «Настаўнік, што добрага зрабіць мне, каб мець жыццё вечнае?» Ён адказаў яму: «Чаму пытаешся ў Мяне пра дабро? Адзін ёсць Добры! Калі хочаш увайсці ў жыццё, захоўвай запаведзі». ... Юнак сказаў Яму: «Усё гэта я захоўваў, чаго яшчэ нестае мне?» Езус адказаў яму: «Калі хочаш быць дасканалым, ідзі, прадай маёмасць сваю і раздай убогім, і будзеш мець скарб у нябёсах; пасля прыходзь і ідзі за Мною». Пачуўшы сказанае, юнак адышоў маркотны, бо меў вялікую маёмасць».*

Толькі часам мы атрымліваем такую вялікую ласку, калі Бог наўпрост гаворыць нам, што мы мусім рабіць. Звычайна Бог дазваляе, каб мы Яго дасканалы план адкрывалі сваімі высілкамі і дзякуючы прынятым высілкам укаранялі ў жыццё. Аднак Бог не пакідае нас самотнымі. Ён прамаўляе да нас праз розныя здарэнні, нашыя поспехі і паразы. Ён асаблівым чынам прамаўляе да нас праз нашага сужэнца, праз досвед іншых людзей, якія дзеляцца ім з намі. Рух END прапануе, каб мы дзяліліся нашымі поспехамі і паразамі ў выкананні пунктаў высілку. Гэта педагогіка Руху END.

Як павінен выглядаць час, калі мы дзелімся выкананнем пунктаў высілку? Перад усім гэта павінна быць шчыра. Калі мы дзелімся, мы будзем канцэнтравацца на тым, што добрага зрабіў Бог у нашым жыцці, у выніку рэалізацыі пунктаў высілку. Мы гаворым аб тым, як мы спраўляліся з выкананнем пэўных пунктаў высілку, якія канкрэтныя дзеянні мы зрабілі, якія былі цяжкасці і які плён мы бачым у сувязі з прынятым высілкам. Гэта можа быць падказка для іншых.

Шчырасць мае на ўвазе, што мы таксама зможам прызнаць свае паразы. Аднак, не выключаем, што часам лепш прамаўчаць аб некаторых фактах, адкрыццё якіх магло б разбурыць адзінства сужэнства. Аповед патрабуе далікатнасці і ад тых, хто ім дзеліцца, і ад тых, хто слухае. Тыя, хто слухае, павінны з вялікай зычлівасцю прымаць сказаныя словы. Мы не гаворым кепскага пра нашага сужэнца. Калі мы дзелімся выкананнем пунктаў высілку мы не кіруемся прыкладам працы бухгалтара. Гэта не баланс.

Скажам яшчэ раз: гэта адкрыццё свайго сэрца перад іншымі, каб паказаць цуд Божага дзеяння ў нас. Нават тады, калі вы зразумееце, што не маеце ніякіх поспехаў,

што вы не заўважылі прысутнасці Бога ў вашым жыцці – скажыце аб гэтым. Гэта выклік для іншых сужэнстваў з суполкі, каб больш інтэнсіўна маліліся за вас, каб падбадзёрвалі вас і падказвалі правільны шлях.

- ***Уводны тэкст да абмену думкамі***

**Жыццё ласкамі сакрамэнту сужэнства**

Падчас сакрамэнту сужэнства нарачоныя бачным спосабам у прысутнасці Касцёла абяцаюць адно аднаму любоў, вернасць і сужэнскую павагу, а таксама абяцаюць, што не пакінуць адно аднаго ажно да смерці. Сужэнскую прысягу заканчваюць, просячы аб дапамозе Усемагутнага Бога і ўсіх Святых.

На ўласныя сілы разлічваюць сужэнцы, якія жывуць у грамадзянскім шлюбе, і яны стараюцца жыць тым, што для ўсіх з’яўляецца важным з людскога пункту погляду: вернасць, дапамога, узаемная падтрымка, кіраванне сям’ёй у этычнай і фінансавай сферы, выхаванне дзяцей, забеспячэнне іх побыту, супольнае жыццё. Праз заключэнне сакрамэнту сужэнцы даюць пачатак новай, жывой сацыяльнай адзінцы ў асяроддзі сяброў і народу.

**Сужэнства перад Богам**

*I) Запавет Бога з людзьмі*

Сужэнства, заключанае перад Богам, з’яўляецца святым сакрамэнтам. Слова «святы» паказвае на больш высокі ўзровень, чым проста чалавечы запавет; сакрамэнт сужэнства з’яўляецца запаветам Бога з мужчынам і жанчынай. Запаветам, які параўноўваюць з тым, калі Бог абяцаў Абрагаму і многім іншым: «Я буду вашым Богам, а вы будзеце Маім народам». Вынікам гэтага запавету з’яўляецца факт, што з кожным разам, калі сужэнства папросіць Бога аб дапамозе, Ён яе акажа, такім ці іншым чынам, у імя гэтага Запавету.

Заручальны пярсцёнак (па-французску слова «запавет» і «заручальны пярсцёнак» - гэта адно слова), які сужэнцы падчас цырымоніі апранаюць адно аднаму на палец, з’яўляецца бачным знакам гэтага запавету. «Так», сказанае кожным з сужэнцаў у прысутнасці святара альбо дыякана, у прысутнасці сведкаў і ўсёй грамады, ўрачыста пацвярджае жаданне запавету з Богам і з тым (той), з якім (з якой) мы звяжам сваё жыццё.

Сакрамэнт святарства з’яўляецца Запаветам: Бога з чалавекам, які пасвячае Яму сваё жыццё і прысвячае сябе служэнню іншым. Ксёндз Кафарэль паказваў падабенства святарства і сужэнства. «Здаецца відавочным, што павінна існаваць паразуменне і ўзаемная падтрымка паміж святаром і сям’ёй». Менавіта па гэтай прычыне ў Equipes Notre-Dame святар стварае суполку разам з сужэнствамі. Святар з’яўляецца «пасланцам да Пана ад сужэнстваў», але таксама тым, хто крочыць разам з імі ў адной камандзе і кіруецца на адну і тую ж з імі вяршыню гары.

У гэтых двух выпадках Запавет застаецца таямніцай замацаванай глыбока ў сэрцы. Запавет дае радасць быцця дзецьмі Божымі і ўпэўненасць, што Яму можна давяраць. Аднак гэта не азначае, што яны не напаткаюць выпрабаванняў, але праз ласкі сакрамэнту сужэнства ці святарства Бог дасць ім сілу і адвагу змагацца з імі. 55 псальм дае надзею на дапамогу ад Пана: «Пакінь Госпаду клопат твой, і Ён падтрымае цябе».

## *II) Дары і ласкі ад Бога ў сакрамэнце сужэнства*

### *1. Сіла супольнага шляху праз жыццё*

Запавет з Богам вельмі канкрэтным чынам змяняе жыццё сужэнцаў: з гэтага моманту яны ўдваіх ствараюць пару, новае сэрца, сям'ю. Яны не могуць больш жыць, як дзве самотныя асобы. Яны маюць новую жыццёвую місію: несці ўдвух Евангелле ўсімі магчымымі спосабамі. Як кажа Евангелле – дзецям, сям'і, усім іншым людзям. Яны таксама з'яўляюцца сведкамі радасці кахання і быцця каханым да канца жыцця.

### *2. Любоў, якая адорвае*

Любоў – гэта дар ад Бога, нават, калі ў наш час у жыцці, у літаратуры ці ў фільмах, сэксуальная прыцягненне выходзіць на першы план у стварэнні саюзу, часам раней, чым народзіцца любоў.

Сужэнская любоў, асвечаная сакрамэнтам, нараджае ў сэрцах жаданне дарыць сябе іншаму, жаданне шчасця іншага чалавека, глыбокага слухання, прысутнасці, служэння, жаданне падкрэсліваць каштоўнасці сужэнца, жаданне прабачэння, якое можа быць складаным у тым, каб яго даваць і атрымліваць. Гэта найважнейшыя хрысціянскія каштоўнасці, якія маюць сваю крыніцу ў Божым Слове.

Калі падчас сакрамэнту сужэнства маладыя нарачоныя кажуць адно аднаму: «Я бяру цябе за жонку/мужа і абяцаю табе любоў, вернасць і сужэнскую павагу, а таксама, што не пакіну цябе ажно да смерці», яны падкрэсліваюць вымярэнне сваёй адданасці ў часе. З дапамогай простых чалавечых сродкаў яны ажыццяўляюць свой выбар, трымаючыся за рукі ў прысутнасці Бога. Гэты жэст можна будзе аднаўляць у моманты розных жыццёвых цяжкасцяў, у гадавіну шлюбу, падчас узаемнага прымірэння г.д. Сіла ад Бога, патрэбная для гэтага прысвячэння на ўсё жыццё, з'яўляецца дарам Бога, ласкай сакрамэнту сужэнства.

### *3. Вернасць*

Сёння ўсё часцей перспектыва вернасці мужу ці жонцы праз ўсё жыццё знеахвочваюць маладых людзей ад заключэння сужэнства, нават калі яны вельмі адно аднаго кахаюць. Як я магу быць упэўнены, што за 20 ці 30 год не сустрэну кагосьці, хто не пераверне маю свядомасць і не знішчыць наш саюз? Адкуль браць упэўненасць, што аднойчы нудота не праслізне да нашага «пастарэўшага» кахання? Як уявіць, што ўсё жыццё я змагу трываць той ці іншы недахоп свайго сужэнца?

Калі сужэнцы разлічваюць толькі на чалавечыя сілы, то гэта сапраўды можа быць выклік звыш сіл. Нават тады, калі сужэнства падтрымліваецца сакрамэнтам, мы ведаем, што няма сталага кахання без цяжкасцяў, якія час ад часу ўзнікаюць у сужэнскім жыцці. Сакрамэнт сужэнства для мужчыны і жанчыны, якія даверыліся Богу, з'яўляецца таксама даверам да Божай любові і Яго дапамогі. Езус абяцаў: «Буду з вамі ва ўсе дні, аж да сканчэння свету».

Калі Пан ёсць прысутны ў іх жыцці праз супольную малітву і штодзённае чытанне Яго Слова, якое падтрымлівае ласку сакрамэнту сужэнства, як агонь на дне сэрца, яны аднойчы зразумеюць, што гэта магчыма. «Чаго не папросіце ў Айца ў Імя Маё, Ён дасць вам» (пар. *Ян* 16, 26).

Як шмат сужэнстваў у Equipes Notre-Dame, якія рэгулярна на працягу многіх год прыкладаюць намаганні рэалізацыі канкрэтных пунктаў высілку, могуць даць шмат прыгожых сведчанняў! І якое вялікае «дзякуй» яны могуць сказаць Богу за цудоўны

дар ласкаў сакрамэнту сужэнства! Яны супольна могуць спяваць: «Бо вялікія рэчы ўчыніў мне Усемагутны, а Імя Яго святое».

4. *Адкрытасць на іншых*

Сужэнствы, якія засяроджваюцца толькі на сабе, на сваіх праблемах і закрытыя на праблемы іншых, асуджаныя на адзіноту. Адной з ласкаў сакрамэнту сужэнства (аб якой можам прасіць Бога) з'яўляецца адкрытасць на іншых. Найбольш важным выражэннем адкрытасці на іншых з'яўляецца адкрытасць на новае жыццё. Звычайна мы думаем аб дзецях у катэгорыі дару, які мы атрымліваем. Тым не менш, дзеці не з'яўляюцца нашай уласнасцю, але гэта не адмяняе факту, што яны з'яўляюцца для нас вялікім дарам. Дзеці паказваюць нашую адкрытасць іншым. У ёй мы будуем вакол сябе атмасферу супакою, дабрыні, зычлівасці, радасці, разумення. Мы прымаем выклік слухаць, падтрымліваць і дапамагаць. Усе гэтыя даброты гэта толькі адна з ласкаў сакрамэнту сужэнства.

5. *Радасць ад кахання і ад адчування сябе каханым*

У сужэнстве, якое будуе адносіны, кожны кахае і з'яўляецца каханым. Але чым з'яўляецца каханне? Калі «мы пройдзем разам толькі кавалак дарогі для таго, каб расстацца, калі штосьці будзе не так», ці можна гэта назваць каханнем?

6. *Ласка супольнай малітвы*

Вялікай ласкай для сужэнства з'яўляецца стаць перад Богам, як двое дзяцей, якія Яго супольна праслаўляюць, любяць і адчуваюць сябе любімымі Ім.

Вялікай ласкай з'яўляецца таксама магчымасць супольнага слухання Слова Божага. Такія практыкі будуюць адносіны, робяць так, што сужэнства становіцца мацней перад жыццёвымі цяжкасцямі.

«Бо дзе двое ці трое сабраныя ў Імя Маё, там і Я сярод іх» (Мц 18, 20).

Якую радасць дае нам гэтая ўпэўненасць!

7. *Якім чынам мы можам клапаціцца ў жыцці аб ласках сакрамэнту сужэнства?*

Вельмі просты спосаб: просячы аб іх нашага Айца кожны раз, калі мы іх патрабуем, нават пасля многіх год сужэнства. У гэтыя хвіліны асабістай альбо супольнай малітвы мы клічам Бога. Мы сустракаемся з Ім на Эўхарыстыі. Раскрываецца таксама жаданне адкрываць – зноў і зноў – сужэнца, праз слуханне яго, глыбокі дыялог, звяртанне ўвагі на яго цярпенне (названае і неназванае), супольнае жаданне пачынаць спачатку. Сужэнцы, якія прагнуць развіцця іх любові, знойдуць яшчэ шмат іншых сродкаў і спосабаў.

***Псальм 1, 1-3***

*Шчаслівы чалавек, які не ходзіць за радай бязбожных,*
*і не ўзыходзіць на шлях грэшных і між насмешнікаў не засядае;*
*але ў Законе Пана яго асалода,*
*над ім разважае ўдзень і ўначы.*

*Ён будзе як дрэва пасаджанае каля воднага патоку,*
*якое плод прыносіць ў свой час,*
*і лісце яго не вяне,*
*а ўсё, што ён чыніць, яму ўдаецца.*

Тэма гэтай сустрэчы падказвае нам пытанні, на якія мы павінны разам шукаць адказаў, магчыма падчас нашага ***«Сядзем разам»***.

• Ці сапраўды мы перажываем наш сакрамэнт сужэнства як трывалы Запавет з Богам?

• Якім чынам мы клапоцімся аб гэтым Запавеце?

- ***Абмен думкамі на сустрэчы*** 

Пытанні ніжэй дапамогуць вам падзяліцца думкамі на сустрэчы.

- Ці даем сведчанне і як, што мы з'яўляемся сакрамэнтальным сужэнствам?
- Ці маем свядомасць, што сакрамэнт сужэнства ставіць нас у прывілеяванае становішча ў параўнанні з грамадзянскімі сужэнствамі? Так / Не – чаму?
- Якім чынам наша суполка END, якая ёсць быццам вяроўка падчас горнага пад'ёма, да якой мы прымацаваныя, дапамагае нам падымацца да Бога, лепш жыць ласкамі сакрамэнту сужэнства?
- Што на практыцы мы можам рабіць у суполцы, каб дапамагаць адно аднаму жыць ласкамі сакрамэнту сужэнства, напрыклад: святкаваць гадавіны шлюбу, сямейныя падзеі, нагадваць адзін аднаму аб прынятай пастанове ў пазнаванні харызмату Руху, супольна маліцца за кожную пару, супольна прымаць удзел у Эўхарыстыі і т.д.

**3. Заданні на час паміж сустрэчамі** 

- **Памятайце аб штодзённым супольным чытанні малітвы** *МАГНІФІКАТ*.
- Правядзіце дыялог у прысутнасці Пана згодна з падказкамі, якія вы атрымалі ў чацвёртай сустрэчы. Узгадайце гэтыя падказкі. Можаце карыстацца пытаннямі па тэме гэтай сустрэчы альбо пытаннямі з чацвёртай сустрэчы.
- Прачытайце на наступную сустрэчу чарговы раздзел з матэрыялаў. Няхай змест гэтай сустрэчы ўплывае на ваша штодзённае жыццё.
- Памятайце аб тым, каб даслаць свае каментарыі пілатуючай пары. Калі палічыце, што прапанаваныя ў матэрыялах пытанні найлепш адпавядаюць вашым чаканням, то вышліце іх.
- Падрыхтуйцеся да дзялення жыццём.
- Дашліце сваю малітоўную інтэнцыю пілатуючай пары.

На наступнай сустрэчы будзем таксама дзяліцца пунктам высілку ***«Сядзем разам»***. Пасля першага вашага такога практыкавання падумайце, чым вы хацелі б падзяліцца. Напачатку дзелімся пазітыўным досведам. Аб паразах гаворым у другую чаргу.